# Уводзіны

Справаздачы за 2006 год аб стане правоў чалавека ў свеце
Падрыхтаваныя Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы
6 сакавіка 2007 года

Гэтыя справаздачы асвятляюць дзейнасць урадаў, скіраваную на практычнае забеспячэнне сваіх міжнародных абавязацельстваў у сферы правоў чалавека. Гэтыя фундаментальныя правы, замацаваныя ва Універсальнай дэкларацыі правоў чалавека Арганізацыі аб'яднаных нацый, складаюць тое, што Прэзідэнт Буш называе "неаспрэчнымі патрабаваннямі чалавечай годнасці". Па словах дзяржсакратара Райс, немагчыма за адзін дзень поўнасцю дасягнуць годнай мэты Універсальнай дэкларацыі ААН, але гэтая праца тэрміновая і адкладаць яе нельга. Універсальная дэкларацыя заклікае "кожнага чалавека і кожны інстытут грамадства…выступаць за павагу да гэтых правоў і свабодаў, і праз прагрэсіўныя нацыянальныя і міжнародныя крокі забяспечваць іх паўсюднае і сапраўднае прызнанне і захаванне…".
Злучаныя Штаты сур'ёзна ставяцца да сваіх абавязацельстваў у сферы правоў чалавека. Мы усведамляем, што пішам гэтую справаздачу ў той час, калі наша ўласная дзейнасць і крокі, што мы прадпрымаем у адказ на тэрарыстычныя напады на нас, ставяцца пад пытанне. Злучаныя Штаты і надалей будуць адказваць належным чынам на шчырую занепакоенаесць, што выказваецца іншымі, у тым ліку і праз падрыхтоўку справаздач, што мы перыядычна прадстаўляем у адпаведнасці з нашымі абавязацельствамі ў рамках шэрагу пагадненняў у сферы правоў чалавека, да якіх мы далучыліся. Таксама мы імкнемся да паступовага і сталага самаўдасканалення. Законы Злучаных Штатаў, палітыка і практыка, што рэгулююць затрыманне падазраваных у тэрарызме, абыходжанне з імі і судовые працэсы над імі, значна эвалюцыянавалі цягам апошніх пяці гадоў. Наша дэмакратычная сістэма кіравання не беспамылковая, але яна *падсправаздачная*: наша магутная грамадзянская супольнасць, нашы дынамічныя сродкі масавай інфармацыі, нашы незалежныя галіны ўлады і добра ўсталяванае вяршэнства закона працуюць як папраўчыя механізмы.
Запатрабаваныя Кангрэсам справаздачы аб стане правоў чалавека ў свеце, што змешчаныя ніжэй, -- гэта істотная частка высілкаў Злучаных Штатаў па забеспячэнні захавання правоў чалавека ў свеце. На працягу трох дзесяцігоддзяў гэтыя штогадовыя справаздачы шырока выкарыстоўваюцца і ў краіне, і за яе межамі як даведнік для вызначэння прагрэсу, што дасягнуты, і выклікаў, што застаюцца. Яны таксама служаць падмуркам для сумесных дзеянняў урадаў, арганізацый і асобаў, што імкнуцца спыніць злоўжыванні і ўзмацніць здольнасць краін абараняць фундаментальныя правы кожнага.
У справаздачах робяцца агляды вынікаў, дасягнутых кожнай краінай у 2006 годзе. Кожная справаздача гаворыць сама за сябе. Аднак можна прасачыць шырокія агульныя тэндэнцыі, што апісаныя ніжэй і ілюстраваныя канкрэтнымі прыкладамі з розных краін. Прыклады, што мы прыводзім, дэманстрацыйныя, а не вычарпальныя.

**Тэндэнцыі дадаюць надзеі, а рэаліі цвярозасці**

Як паказвае агляд дадзеных справаздач, у 2006 годзе ва ўсім свеце людзі працягвалі настойваць на павазе да сваіх правоў, на падсправаздачнасці сваіх урадаў, на тым, каб іх галасы чулі і лічылі, на справядлівых законах і справядлівасці для ўсіх. Шырылася прызнанне таго, што дэмакратыя – гэта форма кіравання, якая дазваляе найлепшым чынам задаволіць грамадскія патрабаванні гонару, свабоды і роўнасці. Гэтыя тэндэнцыя сапраўды абнадзейваюць, але ў справаздачах адлюстраваныя і жорсткія рэаліі:

**Перш за ўсё, прагрэс, дасягнуты ў сферы дэмакратыі і правоў чалавека, было цяжка заваяваць і складана замацаваць. Некаторыя краіны дасягнулі значнага прагрэсу, некаторыя адставалі, а ў некаторых становішча пагоршылася.**

Як дэманструюць прыклады, прыведзеныя ніжэй, вынікі, дасягнутыя краінамі, рэзка адрозніваліся ў залежнасці ад такіх фактараў, як ступень адданасці ўрада сваім абавязацельствам, узровень развіцця інстытутаў, узровень карупцыі і моц грамадзянскай супольнасці. У студзені 2006 года ў **Ліберыі** дэмакратычна абраны ўрад Партыі адзінства на чале з Элен Джонсан-Сэрліф, першай жанчынай-кіраўніком дзяржавы ў Афрыцы, змяніла сабой Нацыянальны пераходны ўрад Ліберыі, што дзейнічаў як часовы ўрад з 2003 года, калі скончылася разбуральная чатырнаццацігадовая грамадзянская вайна. Урад зрабіў значныя крокі, каб выправіць хібы ў сферы правоў чалавека, дапушчаныя ў мінулым, у тым ліку і праз супрацоўніцтва з міжнароднамі партнёрамі з мэтай аднаўлення судовай улады краіны і ўсталявання ў сталіцы офіса грамадскага абаронцы. Прэзідэнт адправіла ў адстаўку ці прыпыніла дзейнасць шэрагу карумпаваных дзяржаўных чыноўнікаў. Пачаў прымаць заявы ад сведкаў Камітэт праўды і прымірэння, створаны ў 2005 годзе для расследавання выпадкаў парушэнняў правоў чалавека і ваенных злачынстваў, здзейсненых падчас грамадзянскай вайны. Нягледзячы на гэты прагрэс, Ліберыя працягвала сутыкацца з сур'ёзнымі выклікамі ў галіне правоў чалавека, у тым ліку звязанымі з яшчэ слабой судовай сістэмай, карупцыяй і беспакаранасцю, гендэрна матываваным гвалтам і надзвычайнай беднасцю, што вяла да выкарыстання дзіцячай працы.
На працягу года працягвала значна памяншацца колькасць забойстваў узброенымі сіламі і паліцыяй у палітычна адчувальных рэгіёнах **Інданэзіі**. У пяцідзесяці чатырох выпадках у асноўным свабодныя і справядлівыя выбары былі праведзеныя на ўзроўнях правінцый, рэгентур, раёнаў і муніцыпалітэтаў. Варта асабліва адзначыць выбары у снежні ў Ацэху, дзе былы палявы камандзір паўстанцаў выйграў губернатарскія выбары. Нягледзячы на тое, што міжусобны гвалт на рэлігійнай глебе ў асноўным пераадолены, у некаторых раёнах ён, тым не менш, працягваўся. Урад і суды не былі здольныя прыцягнуць да адказнасці вінаватых у ранейшых парушэннях правоў чалавека і зверствах, здзейсненых у Інданэзіі і ва Ўсходнім Тіморы.
У **Марока** палітыка ў галіне правоў чалавека прадэманстравала заўважны прагрэс, хаця засталіся і праблемы. Урад пачаў азказваць за ранейшыя парушэнні правоў чалавека праз прадстаўленне кампенсацыі з дапамогай Кансультатыўнай рады па правах чалавека ў сувязі з канкрэтнымі выпадкамі арыштаў, знікненняў і

злоўжыванняў у перыяд паміж 1956 і 1999 гадамі. У сакавіку ўрад прыняў закон, што забараняе катаванне, хаця па-ранейшаму паведамлялася пра выпадкі катаванняў, здзейсненых рознымі адгалінаваннямі службаў бяспекі. Абмеркаванні ў сродках масавай інфармацыі былі шырокімі і ў асноўным адкрытымі, аднак свабоды прэсы і слова заставаліся абмежаванымі. На працягу года ўрад пакараў некаторых журналістаў, якія парушылі абмежаванні на свабоду слова, і многія журналісты практыкавалі самацэнзуру. Гандаль людзьмі, асабліва з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі, а таксама дзіцячая праца заставаліся чыннікамі занепакоенасці. Аднак і урад, і грамадзянская супольнасць усё больш актыўна займаліся вырашэннем гэтых праблем.

**Дэмакратычная рэспубліка Конга** правяла свае першыя дэмакратычныя выбары прэзідэнта і заканадаўчай улады за больш як 45 гадоў, завяршыўшы гэтым трохгадовы пераходны перыяд пасля грамадзянскай вайны. Увайшла ў дзеянне новая канстытуцыя. Аднак стан у галіне правоў чалавека заставаўся дрэнным. У дадатак да канфлікта, што працягваецца на ўсходзе, дзе кантроль урада заставаўся слабым, і ўзброеныя групы працягвалі здзяйсняць сур'ёзныя злоўжыванні, урадавыя службы бяспекі таксама беспакаранна здзяйснялі сур'ёзныя злоўжыванні па ўсёй краіне.

У **Гаіці** грамадзяне дэманстравалі сваю адданасць дэмакратыі, тройчы ў 2006 годзе прыняўшы ўдзел у выбарах. Больш як 3.5 мільёны грамадзян зарэгістраваліся для ўдзелу ў выбарах, і, паводле ацэнак, больш за 70% зарэгістраваных выбаршчыкаў прынялі ўдзел у першым туры прэзідэнцкіх і парламентскіх выбараў, што прайшоў у лютым. У выніку адносна стабільнага і негвалтоўнага выбарчага працэсу быў абраны Прэзідэнт Рэнэ Прэваль і занятыя 129 месцаў у парламенце. У снежні ў Гаіці прайшлі першыя муніцыпальныя выбары за апошнія больш як дзесяць гадоў. Аднак Гаіці яшчэ шмат трэба зрабіць, каб поўнасцю аднавіць вяршэнства закона, у тым ліку наноў адбудаваць недзеяздольную судовую сістэму, перападрыхтаваць і праінспектаваць Нацыянальную паліцыю Гаіці.

Ва **Украіне** працягвалася заўважнае паляпшэнне стану правоў чалавека, звязанае з Аранжавай рэвалюцыяй. Парламентскія выбары 2006 года сталі самымі свабоднымі за 15 гадоў незалежнасці.  Краіна працягвала паляпшаць сітуацыю ў сферах свабоды прэсы, свабоды асацыяцыяў і развіцця грамадзянскай супольнасці. Аднак разам з гэтымі паляпшэннямі застаўся шэраг сур'ёзных праблем, у тым ліку карупцыя ва ўсіх галінах улады.

Хаця сітуацыя з правамі чалавека ў  **Кыргызстане** значна палепшылася пасля пераходу да дэмакратычна абранага кіраўніцтва ў 2005 годзе, у 2006 годзе у выніку тыдня масавых, але мірных маніфестацый была спешна прынятая кантытуцыя з паправамі, якая прапаноўвала магчымасці для сапраўднага стрымлівання і процівагі. Аднак напрыканцы снежня парламент прыняў новую канстытуцыю, якая адмяніла многія элементы стрымлівання і процівагі. Урад таксама рабіў захады супраць няўрадавых арганізацый (НДА, што атрымлівалі фінансаванне з-за мяжы.

Хаця Прэзідэнт Мушараф і абвясціў сваё абяцанне пераходу да дэмакратыі і "асветнай умеранасці", стан правоў чалавека ў **Пакістане** заставаўся дрэнным. Захоўваліся абмежаванні свабоды перамяшчэння, выказвання, асацыяцыяў і рэлігіі. Працягваліся знікненні рэгіянальных актывістаў  і палітычных апанентаў, асабліва ў рэгіёнах, што знаходзіліся пад уздзеяннем унутраных беспарадкаў і паўстанняў. Службы бяспекі працягвалі здзяйсняць пазасудовыя забойствы. Адвольныя арышты і катаванні па-ранейшаму былі распаўсюджаныя. Карупцыя працінала наскрозь урад і паліцыю. Са станоўчых з'яваў можна назваць прыняцце Нацыянальным сходам і падпісанне прэзідэнтам Мушарафам у снежні Закона аб абароне жанчын: упершыню за тры дзесяцігоддзі ўрад Пакістана паспяхова адмяніў законы, што парушалі правы жанчын. У новым законе зменены артыкул 1979 года, што тычыцца згвалтавання і нявернасці супругаў: згвалтаванне караецца цяпер не ў адпаведнасці з законам Шарыяту, а ў адпаведнасці з Пенітэнцыярным кодэксам Пакістана. Таксама закон адмяняе патрабаванне таго, каб для судовага разбіральніцтва ахвяры згвалтавання прадстаўлялі чатырох сведкаў-мужчын.

Хаця ў 2005 годзе ў Егіпце прайшлі першыя ў гісторыі шматпартыйныя прэзідэнцкія выбары, у 2006 годзе заклікі да далейшай дэмакратызацыі і падсправаздачнасці часам сустракаліся з моцнай рэакцыяй з боку ўрада. Працягвалася зняволенне былога кандыдата на прэзідэнтскую пасаду Аймана Нуара, што выклікала сур'ёзную занепакоенасць лёсам палітычных рэформ і дэмакратыі ў краіне. Атрымала развіццё тэндэнцыя, што пачалася ў 2005 годзе: урад арыштаваў і затрымаў у асноўным на тэрміны па некалькі тыдняў сотні актывістаў, звязаных з Мусульманскім братэрствам, арганізацыяй, якая афіцыйна забароненая, але якой дазвалялі існаваць. Дваіх старэйшых суддзяў дапыталі ў лютым ў сувязі з іх публічнымі выступамі ў падтрымку незалежнай судовай сістэмы. Егіпецкая паліцыя арыштавала і затрымала больш як 500 актывістаў за ўдзел у дэманстрацыях у падтрымку незалежнасці судовай сістэмы. У дадатак, задакументаваныя выпадкі прымянення ўладамі катаванняў. Урад таксама арыштаваў, затрымаў і праследваў некалькіх карыстальнікаў Інтэрнэт-блогаў.

У **Казахстане**  урад абмяжоўваў дзейнасць палітычнай апазіцыі праз увядзенне ўскладненых патрабаванняў да рэгістрацыі, а таксама перашкаджаў рэгістрацыі палітычных партый ці адмаўляў у ёй. Зліццё праўрадавых партый кансалідавала моцнае лідэрства партыі "Атан" прэзідэнта Назарбаева і пакінула менш палітычнай прасторы для выказвання альтэрнатыўных поглядаў і прасоўвання рэформ. Урад праследаваў палітычную апазіцыю праз прад'яўленне палітычна матываваных абвінавачанняў і абмежаванне свабоды сходаў, прыняў законы, што абмяжоўваюць правы прэсы, і ціснуў на НДА.

**Расія** знаходзілася пад уздзеяннем далейшай канцэнтрацыі ўлады ў выканаўчай галіне, у тым ліку паправак у выбарчае заканадаўства і новага закона аб палітычных партыях, што дае ўраду шырокія магчымасці рэгуляваць, расследаваць, абмяжоўваць і нават закрываць палітычныя партыі. У спалучэнні з паслухмянай Думай, карумпаванасцю і адвольнасцю праваахоўных органаў, палітычным ціскам на судовую сістэму, абмежаваннямі для няўрадавых арганізацый і СМІ, гэтыя тэндэнцыі прывялі да далейшага разбурэння падсправаздачнасці ўрада. У Чачэніі і іншых рэгіёнах Паўночнага Каўказа працягваліся сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека, у тым ліку незаконныя забойствы і злоўжыванні супраць грамадзянскага насельніцтва з боку службаў бяспекі і федэрацыі, і Чачэнскай рэспублікі. Баевікі-паўстанцы здзяйснялі ў рэгіёне тэтарыстычныя

выбухі і палітычна матываваныя знікненні. Расла колькасць выпадкаў, у якіх Еўрапейскі суд па правах чалавека прызнаваў Расію вінаватай у гэтых злоўжываннях.
У **Венесуэле** ўрад Чавэса працягваў кансалідаваць уладу ў выканаўчай галіне. Урад працягваў рабіць захады супраць апазіцыі і няўрадавых арганізацый і пазбаўляць незалежнасці судовую ўладу. Міжнародныя назіральнікі ацанілі як у асноўным свабодныя і справядлівыя снежаньскія прэзідэнцкія выбары, на якіх Чавэса пераабралі 63% галасоў. У прамове на сваёй інаугурацыі прэзідэнт Чавес папрасіў дазволу ў Нацыянальнага сходу, у якім яго партыі кантралююць 100 адсоткаў галасоў, прадставіць яму права кіраваць праз дэкрэты.
У **Фіджы** і **Тайландзе** ваенныя змясцілі дэмакратычна абраныя ўрады.
**Другая жорсткая рэалія палягае ў тым, што адчуванне неабароненасці, што ўзнікае з-за ўнутранага і/ці трансгранічнага канфлікта, можа быць пагрозай ці прычынай пагаршэння ў сферах правоў чалавека і дэмакратычнага кіравання.**
Нягледзячы на сталыя намаганні ўрада **Ірака** садзейнічаць нацыянальнаму прымірэнню і аднаўленню, прытрымлівацца прынцыпу выбарнасці і ўсталяваць вяршэнства закона, у 2006 годзе міжусобны гвалт і тэрарыстычныя акты сур'ёзна падрывалі прагрэс у сферах дэмакратыі і правоў чалавека. Хаця канстытуцыя і законы Ірака запяспечваюць моцную базу для абароны правоў чалавека, узброеныя групы рабілі напады на правы чалавека, здзяйсняючы катаванні і іншыя злачынствы з двух накірункаў: тыя, хто заяўляе пра сваё варожае стаўленне да ўрада – тэрарысты Аль-Каеды, непрымірыльныя рэшткі рэжыма баасістаў і паўстанцы, што вядуць партызанскую вайну; і тыя, хто ўваходзіць у ваенныя фармаванні шыітаў, а таксама службы бяспекі асобных міністэрстваў, што фармальна з'яўляюцца саюзнікамі ўрада.
Хаця з часу падзення Талібана ў 2001 годзе **Афганістан** дасягнуў важнага прагрэсу ў сферы правоў чалавека, стан правоў чалавека ў краіне быў па-ранейшаму дрэнны. У асноўным гэта тлумачыцца слабасцю цэнтральных інстытутаў і смертаноснымі паўстаннямі: Талібан, Аль-Каеда і іншыя экстрэмісцкія групоўкі ўзмацнілі напады на чыноўнікаў урада, службы бяспекі, няўрадавыя арганізацыі, іншы персанал, што займаецца прадстаўленнем дапамогі, і няўзброеных грамадзянскіх асобаў; колькасць тэрарыстычных актаў з удзелам тэрарыстаў-смертнікаў па працягу года рэзка вырасла, як і колькасць нападаў на школы і настаўнікаў. Стала паступалі сведчанні пра адвольныя арышты і затрыманіі, пазасудовыя забойствы, катаванне і кепскія ўмовы ў месцах зняволення. У снежні прэзідэнт Карзай распачаў Пераходны план дзеянняў "Справядлівасць", створаны як адказ на мінулыя парушэнні правоў чалавека і сродак палепшыць інстытуцыйную якасць сыстэмы юстыцыі. У **Ліване** канфлікт паміж "Хізбалой" і Ізраілем у ліпені-жніўні 2006 года нівелюе крокі ў накірунку рэформ, зробленыя пасля забойства ў 2005 годзе былога прэм'ер-міністра Рафіка Харыры і звязанага з гэтым вываду сірыйскіх войскаў пасля амаль трыццацігадовай акупацыі. Да канфлікта ліванскі ўрад пачаў здымаць перашкоды, што існавалі для дзейнасці палітычных асацыяцый і партый. Пасля таго як "Хізбала" ўвайшла на тэрыторыю Ізраіля з тэрыторыі Лівана, выкрала і забіла некалькіх ізральскіх жаўнераў, узброеныя сілы Ізраіля ў адказ увайшлі на тэрыторыю Лівана. Канфлікт скончыўся спыненнем варожых дзеянняў пры пасрэдніцтве ААН. Нягледзячы на спыненне варожых дзеянняў і разгортванне ўзброеных сіл Лівана і Часовых сіл ААН на поўдні, ліванскія ўзброеныя фармаванні і Хізбала захавалі значны кантроль над часткамі тэрыторыі краіны.
Ва Усходнім Ціморы шэраг смяротных сутычак паміж нацыянальнымі сіламі абароны і разнастайнымі дысідэнцкімі ваеннымі, паліцэйскімі і грамадзянскімі сіламі прывёў да шырока распаўсюджаных вулічных беспарадкаў і гвалту ў сталіцы з удзелам груповак гангстараў. Па просьбе ўрада сілы Аўстраліі, Новай Зеландыі, Малайзіі ды Партугаліі ўзялі на сябе адказнасць за забечпячэнне бяспекі ў сталіцы. 25 жніўня Аб'яднаная місія ААН ва Усходнім Ціморы пераняла абавязкі паліцэйскага нагляду. У выніку гэтага ўнутранага канфлікта каля 150 000 чалавек (больш за 15 адсоткаў насельніцтва краіны) былі вымушаныя пакінуць месцы свайго пражывання.
**Па-трэцяе, нягледзячы на дасягненні ў сферы правоў чалавека і дэмакратычных прынцыпаў ва ўсіх рэгіёнах свету, значная частка чалавецтва ўсё яшчэ жыве ў страху, але марыць пра свабоду.**
Краіны, у якіх улада заставалася сканцэнтраванай у руках непадсправаздачных правіцеляў, як таталітарных, так і аўтарытарных, па-ранейшаму былі самымі паслядоўнымі ў свеце парушальнікамі правоў чалавека.
У 2006 годзе Паўночная Карэя заставалася адным з найбольш ізаляваных і рэпрэсіўных рэжымаў. Рэжым кантралюе амаль усе аспекты жыцця грамадзян, адмаўляе ім у свабодзе слова, прэсы, сходаў і асацыяцый, абмяжоўвае свабоду перамяшчэння і правы працоўных. Канстытуцыя забяспечвае права на «свабоду рэлігійных вераванняў», але сапраўднай рэлігійнай свабоды няма. Каля 150 000 – 200 000 чалавек, у тым ліку палітычных зняволеных, утрымлівалі ў лагерах затрымання, і многія зняволеныя памёрлі ад катаванняў, голаду, хваробаў і холаду.
Каб утрымацца ва ўладзе, ваенны ўрад **Бірмы** шырока выкарыстоўваў смяротныя пакаранні, згвалтаванні, катаванні, адвольныя затрыманні і сілавое перасяленне цэлых вёсак, асабліва тых, дзе прадстаўленыя этнічныя меншасці. Зняволеных і затрыманых падвяргалі злоўжываннем і ўтрымлівалі ў жорсткіх умовах, што пагражалі жыццю. Працягвалася сочка за палітычнымі актывістамі, іх праследавалі і пазбаўлялі волі. Нобелеўскі лаўрэат і лідэр апазіцыі Аунг Сан Су Куй па-ранейшаму была пад хатнім арыштам, больш як 1 000 палітычных зняволеных пакутавалі ў турмах. Па-ранейшаму шырока распаўсюджанымі былі прымусовая праца, гандаль людзьмі, прызыў у войска дзяцей і рэлігійная дыскрымінацыя. Урад зноў склікаў бутафорскі Нацыянальны сход, адвольна адабраўшы кандыдатаў і забараніўшы свабоднае абмеркаванне. Разрэкламаваны як частка «дарожнай мапы да дэмакратыі», сход меў на мэце ануляваць вынікі выбараў 1990 года і прыняць новую канстытуцыю, прымальную для рэжыма. Жорсткія і разбуральныя паводзіны рэжыма таксама выклікалі з'яўленне плыняў уцекачоў, распаўсюд інфекцыйных захворванняў, гандаль наркотыкамі і людзьмі ў суседніх краінах.
**Іранскі** ўрад дапусціў абуральныя парушэнні свабодаў слова і сходаў, узмацніў свае захады супраць дысідэнтаў, журналістаў і рэфарматараў – захады, што характарызаваліся адвольнымі арыштамі і затрыманнямі, перабольшаным выкарыстаннем сілы і шырока распаўсюджаным адмаўленнем у справядлівым і адкрытым судзе. Урад па-ранейшаму затрымліваў і праследаваў бахаяў і прадстаўнікоў іншых рэлігійных меншасцяў, а таксама правёў канферэнцыю, на якой адмаўлялся факт Халакосту і якая

выклікала масавае асуджэнне. Напярэдадні выбараў 15 снежня ў іранскі Сход экспертаў ва ўдзеле адмовілі больш за дзвум трацінам тых, хто падаў заявы, у тым ліку ўсім кандыдатам-жанчынам, і у выніку за многія месцы не было спаборніцтва. Падчас нацыянальных муніцыпальных выбараў таксама былі дыскваліфікаваныя сотні кандыдатаў. У 2006 годзе ўрад па-ранейшаму не зважаў на заклікі ўнутры краіны і з боку іншых дзяржаў да адказнага кіравання, падтрымліваў тэрарыстычныя рухі ў Сірыі і Ліване і заклікаў за знішчэння краіны-сябра ААН.
У **Зімбабвэ** ўрад Мугабэ па-ранейшаму парушаў правы чалавека ва ўсіх сферах. Шырока распаўсюджанымі былі карупцыя і беспакараннасць у афіцыйных колах. Працягвалі дзейнічаць і жорстка абмяжоўваць грамадзянскія свабоды Акт аб дзяржаўных сакрэтах ад 2002 года і Акт аб грамадскім парадку і бяспецы. У 2006 годзе падчас давыбараў у парламент і выбараў ў сельскія раённыя рады ўрад маніпуляваў выбарчым працэсам, ціснуў на выбаршчыкаў і скіроўваў выбары на карысць кандыдатаў ад партыі ўлады. Дамінаванне партыі ўлады дазволіла правесці канстытуцыйныя змены без шырокага абмеркавання. Сілы бяспекі праследавалі, збівалі і адвольна затрымлівалі крытыкаў уладаў і прыхільнікаў апазіцыі. Працягвалася ўмяшальніцтва (часам гвалтоўнае) ў працу фермерскіх гаспадарак і канфіскацыя маёмасці. Кампанія гвалтоўвага высялення, у выніку якой у 2005 годзе падчас Кампаніі на аднаўленні парадку 700 000 чалавек сталі бяздомнымі, працягвалася з меншым размахам. Урад умешваўся ў намаганні гуманітарных арганізацый прадстаўляць дапамогу. У снежні Мугабэ разам са сваімі прыхільнікамі прапанаваў падоўжыць свой тэрмін на два гады праз адсоўванне прэзідэнцкіх выбараў на 2010 год.
На **Кубе** ўрад, якім часова кіраваў Рауль Кастра з-за хваробы Фідэля Кастра, па-ранейшаму парушаў практычна ўсе правы сваіх грамадзян, у тым ліку фундаментальныя правы на мірную змену свайго ўрада, крытыку рэвалюцыі і яе лідэраў. У 2006 годзе ўрад узмацніў свае захады супраць дысідэнтаў і іншых грамадзян, што ўспрымаліся ўрадам як пагроза. Пад назвай "акцыя непрызнання" гэтыя захады часта праяўляліся як масавыя беспарадкі ў форме моўнай абразы і фізічных нападаў. Збіццё затрыманых і зняволеных і неналежнае абыходжанне з імі таксама заставаліся беспакаранными. Хаця па працягу года асобных вязняў адпусцілі, па стане на канец года заставаліся за кратамі не менш як 283 палітычныя зняволеныя, у тым ліку 59 з 75 прадэмакратычных актывістаў і абаронцаў правоў чалавека, што былі арыштаваныя падчас рэпрэсій у сакавіку 2003 года.
У 2006 годзе палітыка **кітайскага** ўрада ў сферы правоў чалавека пагоршылася ў некаторых аспектах. Вырасла колькасць гучных выпадкаў адсочвання, пераследу, затрымання і зняволення палітычных і рэлігійных актывістаў, журналістаў і пісьменнікаў, а таксама адвакатаў, што імкнуліся скарыстацца са сваіх законных правоў. Часам іх сваякоў таксама праследавалі і затрымлівалі. Па-ранейшаму адбываліся шматлікія масавыя дэманстрацыі і акцыі пратэсту з заклікамі да аднаўленння справядлівасці. Былі выпадкі гвалтоўнага падаўлення такіх акцый. Урад прымяняў новыя меры кантролю за няўрадавымі арганізацыямі, СМІ (у тым ліку за Інтэрнэтам), судамі і суддзямі. Нагодай для сур'ёзнай занепакоенасці па-ранейшаму былі захады супраць незарэгістраваных рэлігійных суполак і меншасцяў, асабліва Угхураў і Тыбетцаў.
У **Беларусі** ўрад Лукашэнкі працягваў і ўзмацняў сваю рэпрэсіўную палітыку. Прэзідэнцкія выбары ў сакавіку былі праведзеныя з сур'ёзнымі парушэннямі. Да 1000 чалавек былі арыштаваныя падчас падаўлення публічных акцый пратэсту супраць вынікаў выбараў, і многія былі зняволеныя на кароткія тэрміны. Іншыя актывісты і дзеячы апазіцыі, у тым ліку Аляксандр Казулін, які супрацьстаяў Лукашэнку як кандыдат на прэзідэнцкую пасаду, былі асуджаныя на пазбаўленне волі на тэрміны ад 2 да 5 з паловай гадоў.
Урад **Эрітрэі** па-ранейшаму быў адным з самых рэпрэсіўных у Афрыцы на поўдзень ад Сахары, і ў 2006 годзе яго палітыка ў сферы правоў чалавека пагоршылася. Урадавыя сілы бяспекі здзяйснялі пазасудовыя забойствы. Паступалі вартыя даверу звесткі пра тое, што сілы бяспекі стралялі на месцы тых, хто спрабаваў перасячы мяжу і трапіць на тэрыторыю Эфіопіі. Урад узмацніў сваю кампанію арышту асобаў, што ўхіляліся ад нацыянальнай службы, а таксама іх сваякоў. Паводле звестак, што заслугоўваюць даверу, некаторых арыштаваных катавалі. Як і 2005 годзе, урад загадаў некалькім міжнародным гуманітарным арганізацыям пакінуць краіну, нягледзячы на моцную засуху ў Рагу Афрыкі. Па-ранейшаму існавалі жорсткія абмежаванні на свабоду рэлігіі.
**Чацвёрая рэальнасць, што надае цвярозасці, палягае ў тым, што сусветнае імкненне да большай асабістай і палітычнай свабоды ўзмацняецца і сустракаецца з узмоцненым супраціўленнем з боку тых, хто бачыць пагрозу ў палітычных і сацыяльных зменах.**
Праваабаронцы і няўрадавыя арганізацыі адыгрываюць жыццёва важную ролю ў паспяховым развіцці сваёй краіны. Праблемы сучаснага свету занадта складаныя для таго, каб іх маглі вырашыць паасобку нават самыя магутныя з краін. Унёсак грамадзянскай супольнасці, свабодная плынь ідэяў ды інфармацыі неабходныя для адказу на мноства ўнутраных і міжнародных выклікаў. Сцісканне палітычнай прасторы для няўрадавых арганізацый і грамадскага абмеркавання толькі абмяжоўвае ўласны рост грамадства. Ва ўсіх рэгіёнах свету ў 2006 годзе існавалі ўрады, якія ў адказ на павелічэнне патрабаванняў асабістых і палітычных свабод не выконвалі свае абавязацельствы перад уласнымі народамі, а прыціскалі тых, хто выступаў за правы чалавека і выкрываў парушэнні, напрыклад, няўрадавыя арганізацыі і незалежныя сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку і Інтэрнэт. Выклікае занепакоенаць колькасць краін, што прынялі ці адвольна прымянілі законы і нарматыўныя акты супраць няўрадавых арганізацый і журналістаў. Няўрадавыя арганізацыі і журналісты таксама падвяргаліся пазасудоваму пераследу, часта з боку нявысветленых асобаў. Напрыклад:
У **Расіі** ў красавіку 2006 года пачаў дзейнічаць новы закон аб няўрадавых арганізацыях, што ўводзіць больш жорсткія патрабаванні да рэгістрацыі, забяспечвае строгі кантроль за іх дзейнасцю, непамерна шырокія і ўскладненыя патрабаванні справаздачаў па праграмах і праектах, а таскама надзяляе Федэральную рэгістрацыйную службу правам адмаўляць у рэгістрацыі ці закрываць арганізацыю на падставе невызначаных і суб'ектыўных крытэраў. Свабода выказванняў і незалежнасць СМІ цярпелі ад абмежаванняў і ціску з боку ўрада. У кастрычніку нявысветленыя асобы забілі праваабаронцу Ганну Паліткоўскую, выбітную журналістку, вядомую сваімі крытычнымі матэрыяламі пра парушэнні правоў чалавека ў Чачэніі. Урад выкарыстоўваў свае

кантрольныя пакеты акцый ва ўсіх нацыянальных, а таксама большасці ўплывовых рэгіянальных тэлекампаніях і радыёстанцыях для абмежавання доступу да інфармацыі, якую сам лічыць адчувальнай.
У **Беларусі** празмерныя падаткавыя інспекцыі і патрабаванні да рэгістрацыі НДА ўскладнілі іх дзейнасць. Працягваліся захады супраць прадстаўнікоў незалежных СМІ. У лістападзе актывіста дэмакратычнага руху Зміцера Дашкевіча прыгаварылі да пазбаўлення волі на 18 месяцаў за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.
Урад **Казахстана** зарэгістраваў апазіцыйную партыю "Сапраўдны Ак-Жол" пасля забойства аднаго з яе сустаршынь Сарсенбаюлы і абмежавальна інтэрпрэтавала пяты артыкул канстытуцыі, каб прыпыніць дзейнасць арганізацый, што фінансуюцца з-за мяжы і прадстаўляюць адукацыйныя магчымасці любым партыям, абвясціўшы пры гэтым, што прадстаўленне інфармацыі раўназначна фінансаванню палітычных партый. У ліпені прэзідэнт Назарбаеў падпісаў закон аб унясенні новых абмежавальных паправак у медыйнае заканадаўства, якое ёсць крокам назад у адпаведнасці з ацэнкай Прадстаўніка па свабодзе СМІ Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Урад па-ранейшаму карыстаўся жорсткімі законамі аб паклёпе для накладання штрафаў, вынясення абвінаваўчых выракаў і прыпынення дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі, журналістаў і крытыкаў. У красавіку жорстка збілі супрацоўніка аднаго са СМІ, дзейнасць якога была прыпыненая.
Свабоды выказвання, асацыяцый і сходаў жорстка абмежаваныя ў **Туркменістане**, і ўрад імкнуўся кантраляваць усю дзейнасць няўрадавых арганізацый. Доступ да замежнага спутнікавага тэлебачання ёсць ва ўсёй краіне, але ўлады кантралявалі ўсе СМІ ўнутры краіны, а без спецыяльнага дазволу мясцовым журналістам не дазваляліся ніякія кантакты з замежнікамі. Вельмі абмежаваны доступ у Інтэрнэт прадстаўляўся праз дзяржаўную кампанію "Туркмен Тэлеком"; рэгістрацыя новых карыстальнікаў у сталіцы не дазвалялася з верасня 2002 года. У жніўні ўрад арыштаваў журналістаў Агульсапар Мурадаву, Анакурбана Аманклычава і Сапардурды Хаджыева і на закрытым судовым працэсы прыгаварыла іх да пазбаўлення волі на тэрміны ад шасці да сямі гадоў за захоўванне зброі. У верасні Мурадава, карэспандэнт Радыё Свабода, памёрла ў турме пры падазроных абставінах. НДА паведамлялі, што летам падчас утрымання пад вартай яе і двух калегаў катавалі, каб выбіць прызнанні ў захоўванні зброі. 21 снежня прэзідэнт Сапармурат Ніязаў памёр.
Урад **Узбекістана** імкнуўся кантраляваць дзейнасць большасці НДА. Са спасылкай на нібыта парушэнні закона ён закрыў больш як 200 з іх, у тым ліку міжнародныя НДА, што працавалі ў краіне. Працягваўся пераслед незалежных журналістаў і праваабаронцаў.
Урад **Сірыі** жорстка кантраляваў распаўсюд інфармацыі і забараняў грамадзянанам крытыкаваць урад і абмяркоўваць міжканфесійныя пытанні, у тым ліку рэлігійныя правы і правы меншасцяў. Адбываліся затрыманні і збіццё за выказванне асобамі меркаванняў, што парушалі гэтыя абмежаванні. Напрыклад, у лютым быў арыштаваны журналіст Адэл Махфуз пасля таго, як ён заклікаў да міжканфесійнага дыялогу ў сувязі з супрацьстаяннем, выкліканым з'яўленнем карыкатур з выявай прарока Мухамеда. Праз выкарыстанне медыйнага заканадаўства, пенітэнцыярнага кодэкса і закона аб надзвычайных сітуацыях урад цэнзураваў Інтэрнэт, а таксама абмяжоўваў электронныя СМІ. Мелі месца захады супраць праваабаронцаў краіны, у тым ліку сталае шчыльнае адсочванне і забарона на перамяшчэнне, калі яны спрабавалі наведаць семінары і канферэнцыі за межамі краіны.
Свабода прэсы дасягнула рэкордна нізкага ўзроўню ў **Іране**, дзе ўрад закрыў незалежныя газеты "Шаргх" і "Іран", заблакаваў доступ да Інтэрнэт рэсурсаў агенцый навінаў, у тым ліку "Нью-Йорк Таймс" і "ББС Фарсі", і пазбавіў волі журналістаў і блогераў. Улады выкарыстоўвалі забарону на выезд з краіны як зброю супраць журналістаў.
У **Бурундзі** ўрад больш арыштоўваў, затрымліваў і запалохваў журналістаў і актывістаў-праваабаронцаў. Сярод іншых паліцыя арыштавала і затрымала на некалькі месяцаў прэзідэнта асноўнай НДА, што змагаецца з карупцыяй. Губернатар адной з правінцый нібыта назваў галоўную праваабарончую НДА "Ліга Ітэка" ворагам міру, і ў лістападзе прадстаўнік урада абвясціў, што 32 міжнародныя НДА, зарэгістраваныя ў краіне, могуць быць закрытыя за непрадстаўленне ўраду абавязковых штогадовых справаздач.
У **Руандзе** ўмовы для працы грамадзянскай супольнасці былі абмежавальныя. Па закону нацыянальныя і міжнародныя НДА абавязаныя праходзіць рэгістрацыю кожны год і прадстаўляць ураду справаздачы аб сваёй дзейнасці. Паводле паведамленняў, улады патрабавалі ад некаторых НДА ўзгадніць з урадам некаторыя праекты, каб атрымаць дазвол на выкарыстанне сродкаў, прадстаўленых міжнароднымі донарамі. Акрамя таго, НДА павінны былі далучацца да калектыва, які б кіраваў іх дзейнасцю.
Урад **Венесуэлы** па-ранейшаму запалохваў і праследаваў арганізацыі грамадзянскай супольнасці, асабліва лідэраў НДА па назіранні за выбарамі "Суматэ", суд над якімі па абвінавачанні ў змове і здрадзе за атрыманне замежнага гранта адкладзены на няпэўны тэрмін, але застаецца дамоклавым мячом над іх галавамі. Па стане на канец года на разгледжанні Нацыянальнага сходу знаходзіўся законапраект, які ў выпадку прыняцця ўзмацніць кантроль за фінансаваннем НДА і абмяжуе дзейнасць НДА ў сферах развіцця правоў чалавека і дэмакратыі.
Папраўкі ў пенітэнцыярны кодэкс, якія прадугледжваюць пазбаўленне волі за абразу дзяржаўных чыноўнікаў, а таксама гвалтоўныя напады на журналістаў зрабілі свой унёсак у клімат самацэнзуры. Урад узмацніў пераслед незалежных і апазіцыйных рэсурсаў навінаў. У снежні прэзідэнт Чавэс абвясціў, што ўрад не адновіць ліцэнзію на вяшчанне старэйшай камерцыйнай тэлевізійнай сеткі "Радыё Каракас". Урад назваў уладальнікаў сеткі "змоўшчыкамі" і абвінаваціў іх у тым, што яны не апраўдалі давер грамадства.
У **Кітаі** і нацыянальныя, і міжнародныя НДА па-ранейшаму сутыкаліся з узмацненнем кантролю і абмежаванняў. Па стане на канец 2006 года і па ацэнках "Рэпарцёраў без межаў", ў турмах утрымліваліся 31 журналіст і 52 аўтары, што размяшчалі матэрыялы ў Інтэрнэце. Урад адначасова заахвочваў карыстанне Інтэрнэтам і прымаў меры для кантролю за яго выкарыстаннем, сачыў за зместам, абмяжоўваў распаўсюд інфармацыі і караў тых, хто парушаў патрабаванні. Урад увёў больш строгія патрабаванні да рэгістрацыі, павялічыў дзяржаўны кантроль за зместам рэсурсаў сеткі, і таксама пашырыў вызначэнне супрацьзаконнага

зместу. Урад сістэматычна блакаваў доступ да сайтаў, якія лічыў неадназначнымі, і ўлады, па звестках, пачалі выкарыстоўваць больш прасунутыя тэхналогіі для адвольнага блакавання канкрэтнага зместу, а не саміх сайтаў.

**Вьетнам** па-ранейшаму адсочваў і абмяжоўваў Інтэрнэт, блакіраваў сайты міжнародных праваабарончых НДА і агенцый навінаў. Законы дазваляюць грамадзянам адкрыта скардзіцца на неэфектыўнасць урада і карупцыю, але ўрад працягваў забараняць прэсе пісаць артыкулы, якія ставяць пад пытанне ролю Камуністычнай партыі ці палітыку ў сферы правоў чалавека, заклікаюць да плюралізму ці шматпартыйнай дэмакратыі. Урад забараняе наўпроставы доступ да Інтэрнэту праз паслугі незалежных правайдэраў і патрабуе ад уладальнікаў Інтэрнэт-кафэ, каб яны запісвалі асабістую інфармацыю сваіх наведвальнікаў і сайты, якія яны праглядаюць. Урад выпусціў некалькіх выбітных палітычных і рэлігійных дысідэнтаў, у тым ліку Доктара Фам Хонг Сона, якога пазбавілі волі за пераклад артыкулаў пра дэмакратыю і іх распаўсюд у Інтэрнэце.

**Рэаліяй, што надавала найбольшай цвярозасці, быў генацыд.**

Амаль 60 гадоў пасля прыняцця Універсальнай дэкларацыі правоў чалавека ААН, якая выразіла ў сабе абуранае сумленне чалавецтва злачынствам Халакосту і катаклізмам Другой сусветнай вайны, генацыд працягваў сваю знішчальную справу ў Дарфуры, рэгіёне **Судана.** Нягледзячы на Усеагульнае мірнае пагадненне студзеня 2005 года, якім скончылася 22-гадовая вайна паміж поўначчу і поўднем, і ўсталяванне ў тым жа годзе ўрада адзінства, этнічны канфлікт у **Судане** працягваўся, найбольш катастрафічным чынам у Дарфуры. Суданскі ўрад і падтрыманыя ім узброеныя фармаванні “джаніявід” з’яўляюцца адказнымі за генацыд у Дарфуры, і ўсе бакі дапусцілі сур’ёзныя злоўжыванні, у тым ліку шырока распаўсюджаныя забойствы мірных жыхароў, згвалтаванне як сродак вайны, сістэматычныя катаванні, рабаванне і вярбоўку ў жаўнеры дзяцей.

Па стане на канец 2006 года канфлікт у Дарфуры стаў прычынай смерці не менш як 200 000 мірных жыхароў. Два мільёны чалавек былі вымушаныя пакінуць свае дамы. Больш як 234 000 уцекачоў перайшлі ў суседні Чад. І ў Чадзе, і ў Цэнтральнай афрыканскай рэспубліцы адбыліся гвалтоўныя этнічныя канфлікты ўздоўж межаў з Суданам. Хаця ўрад Судана і даў зразумець, што падтрымлівае дамоўленасці ў Адыс-Абебе, ён публічна адмовіўся прыняць у Дарфуры міжнародныя сілы і аднавіў сваю ваенную аперацыю ў другой палове 2006 года. Узровень бяспекі знізіўся, і некаторыя міжнародныя НДА і гуманітарныя арганізацыі скарацілі ці прыпынілі сваю дзейнасць.

**Абараніць абаронцаў**

Каб вялікае абяцанне Універсальнай дэкларацыі правоў чалавека ААН было выкананае, міжнародная супольнасць, і асабліва дэмакратыі свету, не могуць змірыцца з думкай, што сённяшнія рэаліі, што надаюць цвярозасці, немагчыма змяніць. Яны заклікаюць нас, каб мы аб’ядналіся з тымі, хто працуе дзеля чалавечай годнасці і палітычных рэформ. У 2006 годзе дэмакратычныя ўрады надавалі ўвагу мужным намаганням абаронцаў правоў чалавека. Рэзалюцыі па Ірану, Беларусі, Паўночнай Карэі і Бірме, прынятыя **Генеральнай асамблеяй Арганізацыі аб’яднаных нацый** у 2006 годзе, падкрэслілі неабходнасць абароны абаронцаў правоў чалавека ў гэтых краінах. Фонд дэмакратыі ААН, што з’явіўся ў 2005 годзе ў выніку прапановы прэзідэнта Буша, зробленай падчас Генеральнай асамблеі 2004 года, паспяхова завяршыў свой першы год. Яго рада прыняла рашэнні па фінансаванні 125 з больш як 1 300 праектаў, прапанаваных больш як 100 краінамі, размяркаваўшы больш як 35 мільёнаў даляраў у выглядзе грантаў у асноўным прадэмакратычным грамадскім арганізацыям.

На рэгіянальным узроўні ў чэрвені 2006 года Генеральная асамблея Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў (ААД) прыняла Дэкларацыю Сан-Дамінга - шматбаковае абавязацельства, што ёсць прарывам для краін рэгіёна ў “забеспячэнні волі кожнага чалавека карыстацца свабодай выказвання, у тым ліку мець доступ да палітычных дэбатаў, свабодных ад цэнзуры, і свабоднага абмену ідэямі праз усе віды сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку праз Інтэрнэт.” Міністры замежных спраў таксама абвясцілі пра свой намер распрацаваць дзеля гэтага і заахвоціць выкарыстанне найлепшых стратэгій і практык. Міжамерыканская камісія ААД па Праваабарончым аб’яднанні для праваабаронцаў зрабіла справаздачу на сур’ёзных праблемах, з якімі яны сутыкаюцца ў некаторых краінах, падкрэсліваючы неабходнасць таго, каб урады падтрымлівалі іх працу.

Напярэдадні ліпеньскага сходу кіраўнікоў дзяржаў Афрыканскага саюза грамадскія арганізацыі з 19 афрыканскіх краін сустрэліся ў Банджуле (Гамбія), каб распрацаваць рэкамендацыі для лідэраў саміта ў тым, што тычыцца ролі грамадзянскай супольнасці ў Механізме афрыканскай калегіяльнай ацэнкі выканання краінамі абавязацельстваў у рамках пагадненняў, шляхоў паляпшэння грамадскай супольнасцю доступу да інфармацыі і законаў аб грамадзянстве, што замацоўваюць дыскрымінацыю. Гэтыя рэкамендацыі былі прынятыя на саміце. У рэгіёне шырэйшага Сярэдняга Усходу і Паўночнай Афрыкі Форум дзеля будучыні сабраў прадстаўнікоў урадаў і грамадзянскіх супольнасцяў рэгіёна і іх партнёраў з Вялікай васьмёркі на Мёртвым моры ў Іарданіі. Каля 50 лідэраў грамадзянскай супольнасці, што прадстаўлялі сотні арганізацый з 16 краін рэгіёна, удзельнічалі ў абмеркаваннях пытанняў вяршэнства закона, пашырэння магчымасцяў для жанчын і моладзі, а таксама заканадаўчае асяроддзе дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці. Яны таксама абмеркавалі шляхі ўзмацнення рэформ праз усталяванне механізмаў ацэнкі выканання рэкамендацый. Хаця самае складанае - прыняцце і выкананне рэкамендацый, распрацаваных грамадзянскай супольнасцю, - яшчэ наперадзе, Форум дапамог адкрыць новую палітычную прастору, што як ніколі раней, дазволіла арганізацыям грамадзянскай супольнасці з’яўляцца і ўзаемадзейнічаць з урадамі рэгіёна.

Адзначаючы ў снежні 2006 года Міжнародны дзень правоў чалавека, дзяржсакратар Райс абвясціла пра дзве важныя ініцыятывы ЗША ў падтрымку абаронцаў правоў чалавека і дэмакратыі. Яна абвясціла пра стварэнне Фонда праваабаронцаў, якім будзе кіраваць Дзяржаўны дэпартамент і які будзе аператыўна выдзяляць малыя гранты праваабаронцам, што маюць вострую патрэбу ў выніку дзяржаўных рэпрэсій. Гэтыя сродкі могуць ісці на аказанне аказанне юрыдычнай дапамогі, лячэнне ці задавальненне неадкладных патрэбаў сем’яў актывістаў.

Дзяржсакратар Райс таксама апублікавала ў якасці кіраўніцтва дзесяць “Прынцыпаў НДА”, што рэгулююць адносіны ўрада з такімі арганізацыямі. Гэтыя базавыя прынцыпы будуць рэгламентаваць адносіны ЗША да НДА, і мы таксама будзем іх выкарыстоўваць пры ацэнцы дзеянняў іншых урадаў. Гэтыя прынцыпы закліканыя дапоўніць большыя, дэталёвыя дакументы ААН і іншых міжнародных арганізацый аб праваабаронцах і судзейнічаць сусветнай падтрымцы НДА, што сутыкаюцца з нападамі, як зручны рэсурс для ўрадаў, міжнародных арганізацый, грамадзянскіх суполак і журналістаў.
Калі дэмакратычныя дзяржавы падтрымліваюць працу праваабаронцаў і грамадзянскіх арганізацый, яны дапамагаюць людзям усяго свету вызначаць уласны лёс ва ўмовах свабоды. Калі мы гэта робім, мы будуем больш бяспечны і лепшы свет для ўсіх.
Мы павінны абараняць абаронцаў, таму што яны – праваднікі мірных дэмакратычных зменаў.